**Яўгенаў, А.** Добраахвотна на вайну / А. Яўгенаў // Голас Сенненшчыны. — 2019. — 19 студз. — С. 1, 3.

## ДОБРААХВОТНА НА ВАЙНУ

*У кнізе «Памяць. Сенненскі раён» пра **Дзмітрыя Галкіна**, удзельніка баявых дзеянняў у Афганістане, змешчана вельмі кароткая інфармацыя. І тая недакладная.*

Зрэшты, Дзмітрый Галкін не любіў ці не мог расказваць пра падзеі, што адбываліся ў далёкай краіне. А зараз той прабел таксама не запоўніш. Чалавек, які хадзіў пад кулямі з 17 сакавіка 1981 года па 19 сакавіка 1982 года, быў кантужаны, узнагароджаны медалём, трагічна загінуў у верасні 2003 года падчас палявання.

У Афганістан Дзмітрый Галкін патрапіў у званні прапаршчыка. Тэрміновую службу ён праходзіў ва ўнутраных войсках,там жа застаўся служыць далей. Вясной 1981 года збіраўся ажаніцца.



– Мы яшчэ не падавалі заяву ў загс, але Дзіма паспеў заказаць шлюбны касцюм, – успамінае Ала Галкіна, яго жонка, а ў тую пару нявеста. Інфармацыя пра Афганістан упала як абух на яе галаву. Навошта? Што гэта – загад кіраўніцтва? Сляпы выбар лёсу? Толькі праз гады стала вядома – Дзмітрый Галкін сам напісаў заяву з просьбай накіраваць яго ў Афганістан для праходжання далейшай службы. Хлопцу, які рана страціў бацьку, вельмі хацелася, каб вяселле прайшло не горш, чым у іншых.



Іх група складалася з афіцэраў і прапаршчыкаў унутраных войскаў. На вайну яны выправіліся колькасцю 16 чалавек. Праз год на радзіму, у часці, дзе служылі раней, вярнулася сямёра. – Бацька неахвотна гаварыў пра той перыяд свайго жыцця, пра ўдзел у баявых дзеяннях. А я не настойваў, – Юрый Галкін знешне вельмі падобны на бацьку. Такі ж усмешлівы, рухавы, аматар палявання і рыбалкі. – Памятаю толькі аповяд, як у яго на вачах пры ўзлёце з аэрадрома быў збіты транспартны самалёт, на якім ляцелі на радзіму баявыя сябры-верталётчыкі.

У сямейным альбоме Галкіных да гэтага часу захоўваецца аматарская фотакартка, на якой трое маладых мужчын, мужчын, апранутых у цывільнае адзенне. На зваротным баку надпіс: «На память Диме от друзей-вертолётчиков из Кундуза. Сергей, Лёша, Коля. 9 марта 1982 год».

А вось пісьмы каханай Дзмітрый Гапкін дасылаў з Тэрмеза.

... Яны пажаніліся праз месяц пасля вяртання з Афганістана. На Дзмітрыі быў касцюм, заказаны год таму.

Дзмітрый Галкін працягваў некаторы час служыць у арміі. Характар службы, праўда, рэзка адрозніваўся ад першапачатковага. Прапаршчык, які прайшоў дарогамі Афганістана, працаваў з салдатамі тэрміновай службы. Але яго вольналюбівая душа з цяжкасцю выносіла жыццё па статуце. І неўзабаве прапаршчык Галкін стаў цывільным чалавекам, паступіў у тэхнікум, дзе атрымаў будаўнічую спецыяльнасць. У 1989 годзе сям’я пераехала на Сенненшчыну. Некаторы час жылі ў Белай Ліпе, працавалі ў мясцовым калгасе. Пасля пажару, які здарыўся праз месяц пасля пераезду, аселі ў Сінягорскім. Дзмітрый Галкін працаваў тут прарабам, потым, пасля пакупкі дома ў Сянне – у Сенненскім лясніцтве.

– Дзіма ніколі не выстаўляў напаказ свае баявыя заслугі, ні разу не скарыстаўся льготамі, у тым ліку на атрыманне жылля. Мне хапае таго, што маю, заўжды казаў ён, калі я спрабавала хоць намёкам нагадваць яму пра гэта, – расказвае Ала Галкіна. – Шкада, што Дзіма не дачакаўся ўнукаў, ды і сын узмужнеў без яго. Але памяць пра бацьку і дзеда ў сям'і Юрыя Галкіна захоўваецца. Разам мы штогод бываем на магіле, расказваем унучкам пра дзядулю, бо самае важнае ў жыцці – гэта памяць.

**Аляксандр ЯЎГЕНАЎ**